View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

# РАЗВІЦЦЁ КАМУНІКАТЫЎНАГА ЯДРА АСОБЫ ДЗІЦЯЦІ Ў ПРАЦЭСЕ АЗНАЯМЛЕННЯ З ФАЛЬКЛОРНЫМІ ТВОРАМІ

**Дубініна Дз.М.**

Па зазначэнні даследчыкаў найбольш інтэнсіўна камунікатыўнае ядро асобы складваецца ў старэйшым дашкольным узросце. На нашу думку, яго фарміраванне ў значнай ступені абумоўлена ўвядзеннем у выхаваўчы працэс фальклорнага матэрыялу, які накіраваны на ўзаемаразуменне, ўзаемадзеянне дзяцей паміж сабой і паміж дзецьмі і дарослымі. Выступаючы ў якасці універсальнай педагагічнай сістэмы, фальклор спрыяе актыўнаму пазнанню дашкольнікамі навакольнага свету, сябе; фарміраванню камунікатыўных узаемаадносін. Разам з тым, вусна-паэтычнае мастацтва з'яўляецца першавытокам сацыяльна-культурнай самаідэнтычнасці падрастаючага чалавека. Менавіта таму на фарміруючым этапе нашага даследавання ў якасці сродку камунікатыўнага развіцця асобы дашкольніка намі былі выбраны творы вусна-паэтычнае мастацтва беларускага народа.

Па-першае, гэта звязана з тым, што вусная форма перадачы фальклорнага твора прадугледжвае зварот дарослага да асобы маленькага дзіцяці як да актыўнага суб'екта ўзаемных зносін, раўнапраўнага ўдзельніка размовы.

Па-другое, фальклорныя творы, якія разлічаны толькі на ўзаемныя зносіны ў адпаведнасці са сваёй мастацкай формай і асаблівасцямі, з вялікім майстэрствам адлюстроўваюць мастацтва народа перадаваць не толькі чысты змест сваіх думак, але і жывую афарбоўку пачуццяў, без якой немагчыма сапраўднае спасціжэнне і ўсведамленне іх асноўнага сэнсу. Адсюль і іх значны ўплыў на культуру маўлення як прамоўцы, так і слухача.

Па-трэцяе, вусная форма бытавання фальклору адпрацавала такія выразныя і па-мастацку прыгожыя формы маўлення, якія спрыяюць не толькі яго асэнсаванаму ўспрыманню, але і ўзнікненню пэўнага перажывання сацыяльнага асяроддзя, што адбіваецца на развіцці камунікатыўнага ядра асобы выхаванца (А. А. Бадалёў, Л. І. Бажовіч, А. Ул. Запарожац, М. І. Лісіна, С. Л. Рубінштэйн, Д. Б. Эльконін).

Найбольш спрыяльнымі фальклорнымі творамі для разгортвання камунікатыўных зносін з'яўляюцца беларускія народныя казкі. У гэтых формах фальклору маральная ацэнка тых ці іншых якасцей і ўчынкаў персанажаў выступае асабліва ярка. Змест гэтых твораў раскрываецца часцей за ўсё не шляхам разгорнутага эпічнага апісання, а праз кароткія малюнкі, сцэнкі, эпізоды, у якіх, аднак, даволі выразна малююцца мастацкія вобразы. Прычым перабольшаны і гратэскава-карыкатурны паказ асобных з'яў і рыс персанажаў ніколькі не перашкаджае ўспрыманню выхаванцамі праўдзівасці адлюстраванага ў гэтых творах жыцця. Наадварот, гэта дапамагае завастрыць увагу маленькіх слухачоў пераважна на тых адметных момантах і якасцях,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

якія з найбольшай сілай вылучаюць і падкрэсліваюць галоўнае ў пэўным выпадку або ў адпаведнай з'яве.

Для вырашэння пастаўленых задач намі адзін раз у месяц наладжваліся пазнавальныя гутаркі па матывах беларускіх народных казак ; два разы ў месяц – гульні-драматызацыі па зместу беларускіх народных казак.

Расказванне твораў беларускага фальклору суправаджалася размовай па іх змесце. Яе мэтаю выступала фарміраванне ў дзіцяці матываў паводзін, якімі яно магло б кіравацца ў сваіх учынках, спасціжэнне ім нормаў і правіл чалавечай маралі. Сацыяльна-бытавыя казкі з'яўляліся асновай для абмеркавання пытанняў, якія хвалявалі выхаванцаў. Зместам для гутарак выступалі сапраўдныя жыццёвыя сітуацыі, якія адбываліся з людзьмі ў сацыяльна-бытавых казках, паданнях. Дзеці абмяркоўвалі з дарослымі тое, што адбывалася з персанажамі казкі, спрабавалі вызначыць, як трэба дзейнічаць казачным персанажам. Характар размоў маральна-этычнага плану залежыў ад індывідуальных асаблівасцей і магчымасцей кожнага дзіцяці. Узаемадзеянне дарослага і дзіцяці на аснове дыялогу з прыцягненнем фальклорнага матэрыялу спрыяла не толькі развіццю іх камунікатыўных навыкаў, але і выхаванню ўнутранай культуры выхаванцаў (Н. А. Аксарына, І. Т. Цяпліцкая і інш.), што спрыяла стабілізацыі камунікатыўнага ядра асобы.

У працэсе размоў адбывалася фарміраванне асобасных зносін дзяцей. Пры гэтым мы ўлічвалі той факт, што маральная арыентацыя, з'яўляецца крытэрыем "асобаснага здароўя" ( С. Б. Братусь) і спрыяе найлепшаму развіццю камунікатыўнага ядра асобы. Арганізаванае мастацка-маўленчае асяроддзе дазваляла дзіцяці адчуць адзінства з героямі фальклорных твораў. Гэта ўплывала на станаўленне ў дзіцяці адэкватнай самаацэнкі, спрыяла рэгуляванню яго паводзін, развівала камунікатыўныя навыкі.

Узаемадзеянне педагога і дзяцей ажыццяўлялася пад уплывам апераджаючай ініцыятывы дарослага. Кіруючыся апераджаючай ініцыятывай педагог імкнуўся, каб дзіця само паспрабавала асэнсаваць і ацаніць чалавечыя ўчынкі і адносіны.

Педагагічныя каментарыі пасля расказвання безумоўна мелі месца, але галоўнай мэтай педагога з'яўлялася імкненне да таго, каб размова прабуджала перажыванні дзяцей, спрыяла глыбокаму асэнсаванню імі абмяркоўваемых учынкаў і правілаў грамадзянскіх паводзін.

Рэалізацыя асноўнай мэты размовы спрыяла ўзнікненню ў дзяцей эмацыянальных перажыванняў, адпаведных адносін да канкрэтных фактаў і з'яў. Калі дзіця не адказвала на пытанні, дарослы сам выказваў сваю думку і абгрунтоўваў яе. Пры гэтым, мы ўлічвалі заўвагу А. А. Смірновай, наконт таго, што дарослы павінен сам быць актыўным ўдзельнікам размовы, выказваць сваю думку наконт разглядаемых падзей.

З захапленнем старэйшыя дашкольнікі разважалі пра такія людскія якасці, як дабрыня, упартасць, прагнасць. Працягласць такой гутаркі вызначала само дзіця. Калі выхавальнік адчуваў, што дзіцяці не цікава, размова на адпаведную тэму, то размова не працягвалася.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Адпрацоўка набытых камунікатыўных уменняў здзяйснялася ў гульні-драматызацыі. У яе працэсе з найбольшай дакладнасцю праяўляўся патэнцыял успрымання дзецьмі мастацкага твора, які яны раскрывалі з дапамогай пэўных камунікатыўных сродкаў.

Такім чынам педагагічнае забяспячэнне развіцця камунікатыўнага ядра асобы дашкольніка ўяўляла сабой спецыяльнаарганізаваны працэс, які характарызаваўся станаўленнем у дзіцяці станоўчых адносін да сябе, да акружаючых, уменнем структураваць сваю камунікатыўную дзейнасць, зыходзячы з традыцый народнай культуры, у аснове якой ляжыць гуманізацыя каштоўнасна-сэнсавай сферы асобы.

Творы вуснага славеснага мастацтва мэтанакіравана і гарманічна развівалі камунікатыўны і маральна-каштоўнасны патэнцыял дзіцяці. Мастацкае слова фальклору дапамагала дашкольнікам не толькі не згубіць, а нават і далей развіць той, дараваны ім ад самога нараджэння, дар дзяцінства, дзе душа і сэрца накіраваны на іншага чалавека. Акрамя таго, фальклорныя творы выступалі для дашкольнікаў і як узор маральных паводзін, скарбніца розных лёсаў і характараў, сімвал чысціні і міласэрнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ